
Ружанец – ратунак для свету

Аўтар: кс. Ян Раманоўскі
07.10.2018 00:00



Восень – незвычайная пара года. Нягледзячы на тое, што ў гэты час больш востра адчуваем холад, апранаем цяплейшае адзенне, часцей заходзім у аптэку па лякарствы ад прастуды, а ў сацыяльных сетках чытаем ці нават самі пішам, што хацелася б вярнуцца ў цёплыя і радасныя летнія хвіліны – восень з'яўляецца выключнай.

У Касцёле незвычайнасць гэтага перыяду праяўляецца ў тым, што ў кастрычніку асаблівай пашанай ахінаем Маці Божую праз ружанцовую малітву. Можа, часам у галаву прыходзіць думка, што ўжо столькі разоў нам казалі пра яе значэнне, столькі разоў заахвочвалі да яе, аднак варта памятаць, што малітвы ніколі не бывае зашмат. Сведчаннем гэтага з'яўляюцца вернікі, якія ў святынях, капліцах і дома ў розных кутках свету збіраюцца, каб супольна адгаворваць Ружанец, паколькі гэтая малітва мае асаблівую моц і можа многае змяніць у жыцці. † Каб узяць у рукі ружанец, патрэбна вера



Не хачу вяртацца да гісторыі ўзнікнення ружанцовай малітвы, паколькі яна, напэўна, ужо ўсім вядомая. Нашмат важней, на маю думку, паразважаць над значэннем Ружанца ў нашым штодзённым жыцці. Так! Штодзённым! Не толькі ў кастрычніку ці ў першую

суботу, з пэўнай нагоды ці пасля таго, як на споведзі атрымалі наказ памаліцца Ружанец за пакуту, але кожны дзень, незалежна ад пары года і месца. Чаму і навошта? Таму што гэта вельмі плённая малітва. Але каб адчуць яе плён ва ўласным жыцці, трэба спачатку ў гэта паверыць. На папрок аб тым, што гэта малітва, у якой бяссэнсна паўтараюцца тыя самыя словы, айцец дамініканец Жан-Баціст Лакардэр, прапаведнік і пісьменнік, заўважыў: “Каханне знае толькі адно слова. Але нават прамаўляючы яго бясконца, мы ніколі не паўтараемся”. Франсуа Марыак, член Французскай акадэміі, аднойчы сказаў: “Сціскане ружанца падобнае чымсьці на трыманне за руку маці, якая пераводзіць нас праз дарогу”. Таму, адгаворваючы ружанцовую малітву, мы выпрошваем заступніцтва і апекі Найсвяцейшай Панны Марыі. Такім чынам аднаўляем таксама любоў да Багародзіцы, якая ўжо здзейсніла столькі цудаў для ўсяго чалавецтва і асобных людзей ва ўсім свеце.

Багацце Ружанца

Чаму Ружанцу надаецца такая вялікая роля? Каб адказаць на гэтае пытанне, хацелася б больш дакладна прыглядзецца да асобных малітваў, з якіх ён складаецца, звярнуць увагу на іх змест і значэнне.

Робячы на сабе Знак Крыжа, заклікаем Трыадзінага Бога: Айца, Сына і Святога Духа. Так мы злучаемся з крыжом Езуса Хрыста, на якім Збаўца памёр за нас і які павінен працінаць усё наша жыццё.

“Веру ў Бога Айца Усемагутнага”, называемае таксама Апостальскім сімвалам веры, з’яўляецца найважнейшым прызнаннем веры Каталіцкага Касцёла. Уключае ў сябе найважнейшыя праўды, у якія мы як хрысціяне верым, якія прымаем і на якіх павінны будаваць сваё жыццё. У гэтай малітве вызнаём веру ў Адзінага Бога, які з’яўляецца Айцом і Панам усяго стварэння, у Езуса Хрыста, Бога і Чалавека, які з любові да людзей памёр і ўваскрос, каб указаць нам мэту пілігрымавання, у Святога Духа, святы Касцёл, заснаваны Збаўцам, еднасць з Касцёлам і з тымі, хто апярэдзіў нас на дарозе ў Нябесную Айчыну; затым – у аздараўленчую моц святых сакрамантаў, у абяцанае Месіем уваскрашэнне ў канцы часоў і, урэшце, у вечнае жыццё, поўнае шчасця і свабоднае ад усякага зла.

Малітву “Ойча наш” Езус перадаў сваім вучням, калі папрасілі Яго: “Пане, навучы нас маліцца” (Лк 11, 1). У ёй мы праслаўляем нябеснага Айца і ўзносім свае просьбы. Просім Бога, каб Ён быў асвечаны ў нас, каб нашыя сэрцы былі Яго святыняй. Заклікаем Божае Валадарства, бо менавіта яно нясе зразуменне, супакой, дабрыню і радасць. Прыгадваем сабе, што ўвойдуць туды толькі тыя, хто з пакорай прымае і выконвае волю Бога. Молім быць міласэрнымі да нас, абараніць ад спакус і прагнасці, збавіць ад моцы д’ябла. Кожнае “Вітай, Марыя” з’яўляецца напамінам аб моманце Звеставання Найсвяцейшай Панны Марыі – радаснай навіны аб тым, што Яна стане Маці Збаўцы ўсяго чалавецтва. У 2-ой частцы малітвы, што пачынаецца словамі “Святая Марыя”, заключана просьба апекавацца намі грэшнымі і быць заступніцай цяпер, падчас зямной вандроўкі, і ў хвіліну, калі будзем пакідаць гэты свет.

Ружанец – ратунак для свету

Аўтар: кс. Ян Раманоўскі
07.10.2018 00:00



